які добра адпачыў. На нашу думку, таксама, не хапіла ў акцёрскім гучанні стрыманасці, адчування небяспекі ў сцэне размоў у дарозе ва ўмовах магчымасці натрапіць на фашыстаў. Аднак дастаткова працяглы па гучанні твор атрымаўся цэласным. Прэм'еру радыёспектакля «Воўчая зграя» прымеркавалі да 95-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі В. Быкава і 75-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Такім чынам, тэма вайны ў радыётэатры Беларусі застаецца актуальнай і запатрабаванай. У сучасных радыёспектаклях адбываецца пераасэнсаванне ваенных падзей, учынкаў асобных герояў і антыгерояў, спавядаюцца тэмы міру і яго важнасці ў жыцці чалавека, няскоранасці духу і слабасці ў пэўных абставінах, маштабнага патрыятызму і асабістай трагедыі. Асноўным драматургічным матэрыялам для сучасных аўдыяльных пастановак з'яўляюцца інсцэніроўкі вядомых літаратурных твораў. Высокі мастацкі ўзровень радыёспектакляў забяспечваюць вопытныя майстры радыёсправы, акцёры мінскіх тэатраў, прафесійныя кампазітары і музычныя калектывы Белтэлерадыёкампаніі.


1. *Соня Гурыч.* Жыццё ў беларускім мастацтве : зборнік / склад. М. Л. Іваноў. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2004. – 122 с.

2. *Трапянок, У. А.* Рэпрэзентацыя твораў В. Быкава на ваенную тэматыку ў тэлевізійным і радыётэатры Беларусі / У. А. Трапянок // Культура. Наука. Творчество : IX Междунар. науч.-практ. конф., редкол.: В. М. Черник (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2016. – С. 223–227.

3. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 207 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНТЭРАКТЫЎНЫ МУЗЕЙНЫ ЗАНЯТАК «ВОДБЛІСК НАЙВЯЛІКШАЙ ПЕРАМОГІ»


***Н. В. Трафімчык,***
*вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь»*

***Н. М. Усава,***
*вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь»*


Сёлетні год адзначаны важным юбілеем – 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Нягледзячы на аддаленасць у часе падзей вайны, памяць пра іх беражліва захоўваецца і перадаецца з пакалення ў

пакаленне, у тым ліку пры дапамозе твораў мастацтва, якія здаўна вядомы сваім асаблівым ідэйна-эмацыйным уздзеяннем на чалавека. Выяўленчае мастацтва дае багаты фактычны матэрыял для гутарак на патрыятычныя тэмы, спрыяе фарміраванню пачуцця прыгожага і правільнага стаўлення да свету, фарміруе свядомасць, асабліва ў юным узросце.

На пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь асаблівае месца займае маштабнае палатно Валянціна Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года». Карціна памерамі 5х3 м нязменна прыцягвае ўвагу наведвальнікаў розных узростаў. Карцін ваеннай тэматыкі 1940–1980-х гадоў у калекцыі музея налічваецца каля тысячы, некалькі – у экспазіцыі. Але гэта работа была асабліва адзначана сучаснікамі і мае выразную дакументаваную гісторыю стварэння. Ёй прысвечана некалькі дакументальных фільмаў, фатаздымкаў, кінахронікі, успамінаў сучаснікаў-мадэляў.

Таму менавіта гэту работу было вырашана выкарыстаць для правядзення інтэрактыўнага занятку для студэнтаў 1–3-х курсаў ВНУ і вучняў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту «Водбліск найвялікшай Перамогі» (да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне).

Ідэя ў тым, каб прысвяціць час уважліваму вывучэнню аднаго твора, спакойна і не спяшаючыся з дапамогай экскурсаводаў-медыятараў прааналізаваць яго. Бо, як паказваюць даследаванні, мы глядзім на твор мастацтва ў сярэднім 9 секунд [1, с. 21]. Нават сусветна вядомыя шэдэўры не ў стане ўтрымліваць увагу наведвальнікаў нашмат даўжэй.

На занятку плануецца група колькасцю не больш за 15–18 асоб. Прадугледжваюцца крэслы ці банкеткі для камфортнага агляду.

У якасці мэтавай аўдыторыі быў выбраны досыць шырокі кантынгент: вучні сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Групы з устаноў адукацыі складаюць у музеях найбольшы працэнт ад агульнай колькасці наведвальнікаў. Таму адукацыйны напрамак работы музеяў быў і застаецца вядучым. Акрамя таго, мае значэнне і той факт, што школьны ўзрост з'яўляецца адным з самых спрыяльных для ўмацавання маральных прынцыпаў, фарміравання такіх сацыяльных каштоўнасцей, як грамадзянскасць і патрыятызм. Далучэнне вучняў да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы – важны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. А будучае краіны, шлях развіцця грамадства, як вядома, напрамую залежаць ад таго, якая маральная аснова ў маладога пакалення, якія каштоўнасці будуць сфарміраваныя ў яго сёння. І музей можа зрабіць свой важны ўнёсак у гэтую справу.

Асабліва рэкамендаваны занятак для школьнікаў 9-х класаў, якія вывучаюць гісторыю Другой сусветнай вайны сінхронна ў рамках курса «Сусветнай гісторыі» і адначасова гісторыю Вялікай Айчыннай вайны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па прадмеце «Гісторыя Беларусі». Музейны занятак будзе карысным дадатковым метадычным матэрыялам для студэнтаў 1–3-х курсаў гістарычнага, філалагічнага і педагагічнага факультэтаў, якія вывучаюць гэтую тэму ў рамках гісторыі Расіі і ўсходнеславянскіх народаў і на кафедры гісторыі Беларусі.

Формай правядзення быў абраны інтэрактыўны падыход, бо менавіта ў яго межах магчыма не проста данесці патрэбную інфармацыю да слухачоў, але і эмацыянальна перажыць вобразны строй карціны, матываваць слухачоў удзельнічаць у дыскусіі, дыялогу, нават ролевай гульні і тым самым паглыбіць веды, а таксама больш эфектыўна замацаваць іх. За аснову быў узяты так званы «павольны агляд», прынцып расказа і «пагружэння» ў кантэкст, аналіз і абмеркаванне дэталяў, ролевая гульня.

Тэхнічнае абсталяванне – тэлевізар з маніторам вялікага памеру, на якім дэманструюцца архіўныя відэа- і фотаздымкі, музычны цэнтр з запісам песень, лазерная ўказка, спецыяльна падрыхтаваныя карткі з фрагментамі карціны, якія даюць дадатковую інфармацыйную канву занятку.

Занятак па двух загадзя напісаных сцэнарыях (70 хвілін і скарочаны – 45 хвілін) праводзяць два супрацоўнікі, кожны з якіх мае свае задачы. Гэта надае занятку неабходныя тэмп і дынамічнасць, дазваляе эканоміць час.

Пры распрацоўцы музейнага занятку «Водбліск найвялікшай Перамогі» аўтарамі найперш ставілася мэта шляхам павольнага разгляду і дэталёвага аналіза работы В. Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года» пазнаёміць наведвальнікаў з гісторыяй вызвалення сталіцы Беларусі (і тым самым садзейнічаць росту цікавасці да гісторыі Беларусі), а таксама пры дапамозе аповеду пра гісторыю напісання карціны актывізаваць пазнавальную і творчую дзейнасць слухачоў. Да ліку задач, якія планавалася вырашыць, былі аднесены:

– акрэсліць асноўныя этапы акупацыі і вызвалення Мінска;

– пазнаёміць з гісторыяй стварэння карціны В. Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года»;

– развіваць ва ўдзельнікаў назіральнасць і ўвагу да мастацкага твора;

– спрыяць фарміраванню мастацкага густу, мастацкага мыслення;

– выхоўваць цікавасць да «паўсядзённай» гісторыі дадзенага перыяду, пачуццё патрыятызму;

– стымуляваць вывучэнне гісторыі XX ст., гарадской тапанімікі і дадатковай мемуарнай літаратуры; паходы на адпаведныя экспазіцыі ў іншыя музеі – Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Музей гісторыі Мінска і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Занятак уключае ў сябе некалькі інфармацыйных блокаў, якія дынамічна перацякаюць адзін у другі.

Падчас занятку ў першую чаргу вучням прадастаўляецца асноўная інфармацыя пра часы акупацыі сталіцы Беларусі. Для вырашэння гэтай задачы распрацоўшчыкі праграмы выкарыстоўвалі дакументы ваеннага часу, успаміны мінчан, якія пеpажылі акупацыйны перыяд. Вялікае значэнне мае аўдыяльны і візуальны матэрыял (запісы паведамленняў Саўінфармбюро, фота акупацыйнага Мінска, кадры кінахронікі ваеннага часу), што падкрэслівае складанасць, напружанасць часу, дазваляе наведвальнікам эмацыянальна напоўніцца пачуццём цяжкасці сітуацыі, у якой апынуліся жыхары Мінска амаль 80 гадоў таму.

Асобны блок прысвечаны гісторыі вызвалення Мінска. Падчас падрыхтоўкі гэтай часткі вышукваліся ўспаміны рэальных удзельнікаў падзей: як вайскоўцаў, што прымалі ўдзел у вызваленні, так і жыхароў горада. Напрыклад, цікавую інфармацыю ўдалося знайсці на сайце Мінабароны Расіі, дзе летась да 75-годдзя вызвалення сталіцы Беларусі былі выкладзены рассакрэчаныя гістарычныя архіўныя дакументы, што адлюстроўваюць малавядомыя эпізоды наступальнай аперацыі «Баграціён», дэталёва апісваюць вызваленне горада, радасць, з якой насельніцтва сустракала воінаў-вызваліцеляў. Пра гэта сведчаць, у прыватнасці, наступныя словы з палітданясення начальніку палітупраўлення 3-га Беларускага фронту генерал-маёру Казбінцаву: «Колонны танков, проходя по городу, забрасывались цветами, так что танки были больше похожи на огромные букеты цветов, а не на грозные боевые машины» [2].

Асноўная частка праграмы, безумоўна, прысвечана постаці майстра – народнага мастака БССР Валянціна Волкава і яго манументальнай рабоце «Мінск 3 ліпеня 1944 года». У цэнтры ўвагі – асоба жывапісца; прычыны, па якіх ён узяўся за стварэнне карціны пра вызваленне Мінска; гісторыя напісання палатна і яго лёс пасля завяршэння работы; цікавыя факты, якія датычацца натуршчыкаў; ацэнка карціны сучаснікамі.

Увазе гледачоў прапануюцца цікавыя, малавядомыя шырокай публіцы факты і архіўная дакументалістыка, якія, упэўнены, прыцягнуць увагу не толькі да канкрэтнай карціны, але і да легенды беларускага выяўленчага мастацтва – Валянціна Волкава. А эмацыянальна насычаная інфармацыя пра ваенныя падзеі ў Мінску паспрыяе глыбейшаму разуменню абставін, у якіх апынуліся жыхары акупіраванай сталіцы Беларусі, будзе фарміраваць пачуццё патрыятызму, гордасці за беларускі народ.

На працягу занятку ўдзельнікам прапануецца самім узгадаць некалькі важных дат у гісторыі Беларусі і Мінска (пачатак вайны, вызваленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сталіцы, Перамога), пазнаць месца ў сучасным Мінску, якое В. Волкаў адлюстраваў на карціне, паразважаць над тым, хто такія падпольшчыкі, у чым заключалася іх дзейнасць у акупіраваным горадзе (практыка паказвае, што сучасныя школьнікі, на жаль, даволі слаба арыентуюцца ў гэтым пытанні) і інш.

Цікавым элементам праграмы стаў пошук удзельнікамі персанажаў на карціне. Вядома, што ўсе людзі, прадстаўленыя на палатне, пісаліся В. Волкавым з натуры. Адмыслова для занятку распрацоўшчыкамі былі падрыхтаваны карткі з выявамі герояў палатна, якія раздаюцца ўсім удзельнікам занятку. Задача некалькіх вучняў – знайсці на рабоце «сваю» дзеючую асобу і, па-першае, паспрабаваць аднавіць позу натуршчыка, пратрымацца ў ёй хаця б некалькі хвілін, а па-другое, паразважаць, пафантазіраваць, кім мог быць гэты чалавек, як складваўся яго лёс у час вайны і пасля яе, пра што ён марыў і чаму радаваўся, чаго, магчыма, баяўся, з кім сябраваў і г.д. Паколькі пра многіх натуршчыкаў маюцца дастаткова падрабязныя звесткі, музейны супрацоўнік (вядучы занятку) можа ў выніку ці абвергнуць, ці пацвердзіць здагадкі ўдзельнікаў.

Захапляючай часткай занятку з'яўляецца таксама імправізаваны дыспут вакол работы. Згодна з архіўнымі дакументамі, калі ў 1955 г. карціна Волкава была прадстаўлена на Дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве, многія вядомыя дзеячы культуры выказалі свае думкі наконт яе. І гэта не заўсёды былі хвалебныя водгукі. Таму і вучням, разбітым на два лагеры («крытыкі» і «фанаты» карціны) прапаноўваецца адчуць сябе сапраўднымі мастацкімі крытыкамі, паразважаць над вартасцямі і недахопамі работы.

Завяршальным акордам занятку становіцца «ажыўленне» карціны Валянціна Волкава «Мінск 3 ліпеня 1944 года», калі кожны з удзельнікаў прымае позу свайго персанажа, атрыманага раней па картцы, займае адпаведнае месца перад палатном, а музейны супрацоўнік робіць памятны агульны здымак, які дасылае на электронны адрас школы.

Занятак «Водбліск найвялікшай Перамогі» – гэта не адзінаразовы праект, хаця, канечне, яго правядзенне найбольш актуальна менавіта ў найбліжэйшыя да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці даты. Улічваючы, аднак, тое вялікае значэнне, якое мае вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў патрыятычным выхаванні, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што дадзеная форма работы знойдзе шырокі водгук як сярод настаўнікаў, так і сярод вучняў. Тым больш што знаёмства з гістарычным перыядам праз прызму мастацкай работы дасягае адразу некалькіх мэтаў. Гэта і прыцягненне ўвагі да айчыннай гісторыі, і выхаванне эстэтычнага густу, і (што, хіба, найбольш важна менавіта для музея) фарміраванне цікавасці да музея ў цэлым. Бо кожны зацікаўлены вучань – гэта патэнцыйны наведвальнік новых экспазіцый і ўдзельнік новых заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мы ўпэўнены, што падобнага роду праекты, дзе вучні з'яўляюцца не пасіўнымі гледачамі, а актыўнымі ўдзельнікамі, спрыяюць працэсам мыслення, усведамлення і засваення, а гэта ў сваю чаргу дапамагае надалей творча выкарыстоўваць атрыманыя веды ў працэсе вырашэння канкрэтных практычных задач, стымулюе выпрацоўку ўласнага погляду на праблему, пошук свайго шляху вырашэння любога пытання [3, с. 88–89].


*1. Идема, Й.* Как ходить в музей. Советы о том, как сделать посещение музея по-настоящему запоминающимся. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2018. – 128 с.

*2.* Из Минска виделся Берлин: К 75-летию освобождения столицы Белоруссии [Электронный ресурс] // Минобороны России. – 2019. – Режим доступа: http://minsk75.mil.ru/. – Дата доступа: 15.02.2020.

*3. Месхия, Э.* Методы интерактивного обучения в современных музейных проектах / Э. Месхия // Артэфакт : навук.-метад. часоп. – 2017. – № 8. – С. 82–90.


## РОЛЬ ЭЛЕКТРОННЫХ РЕСУРСОВ В ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОМ ВОСПИТАНИИ: ИЗ ОПЫТА РАБОТЫ ЦЕНТРАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКИ ОЧЕРСКОГО ГОРОДСКОГО ОКРУГА ПЕРМСКОГО КРАЯ


***Е. О. Шадская,***

*заведующий сектором по web-коммуникациям отдела электронных ресурсов и информационных технологий Муниципального автономного учреждения культуры «Центральная библиотека Очерского городского округа»*


Одной из приоритетных задач развития Российской Федерации в последние годы является создание условий для повышения уровня консолидации общества, укрепления гражданской ответственности, чувства сопричастности к великой истории и культуре России, обеспечения преемственности поколений, воспитание бережного отношения к историческому наследию. Реализация такой непростой задачи происходит через развитие системы патриотического воспитания, включающей в себя, в т. ч., апробацию и внедрение современных программ, методик и технологий [3]. Они реализуются различными социальными институтами, в т. ч. библиотеками.

Усиление роли электронных ресурсов – одна из значимых тенденций в практике библиотечного обслуживания. Сегодня они успешно приме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ